# Вечары памяці А. Н. Радзішчэва

Грамадскасць рэспублікі адзначыла 150-годдзе з дня смерці выдатнага рускага пісьменніка А. Н. Радзішчэва. Памяці яго была прысвечана навуковая сесія ў Акадэміі навук БССР. З дакладам «Філасофскія погляды А. Н. Радзішчэва» выступіў доктар філасофскіх навук І. Лушчыцкі. Кандыдат гістарычных навук І. Краўчанка зрабіў даклад на тэму «Гістарычныя погляды А. Н. Радзішчэва», кандыдат эканамічных навук В. Аксельрод — «Аграрнае пытанне ў працах А. Н. Радзішчэва».

У Дзяржаўнай бібліятэцы імя В. І. Леніна і ўрадавай бібліятэцы імя А. М. Горкага адкрыты выстаўкі твораў пісьменніка і літаратуры аб ім. Сярод кніг на выстаўцы — «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву» ў перакладзе на беларускую мову.

Літаратурны вечар адбыўся ў Саюзе савецкіх пісьменнікаў БССР. З дакладам аб жыцці і дзейнасці А. Н. Радзішчэва выступіў прафесар І. Гутараў. Народная артыстка БССР Л. Ржэцкая прачытала творы пісьменніка — оду «Вольнасць» і ўрывак з «Падарожжа з Пецербурга ў Маскву».